ВЕСЦІ АКАДЭМІІ АГРАРНЫХ НАВУК БЕЛАРУСІ
№ 3 1995

# СУЧАСНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ЗЕМЛЯРОБСТВА

20—21 кастрычніка 1994 г. Акадэмія аграрных навук Рэспублікі Беларусь правяла ў Мінску сесію «Індустрыялізацыя і сацыяльна-экалагічныя праблемы выкарыстання зямельнага фонду». У рабоце сесіі прынялі ўдзел звыш 300 вучоных рэспублікі і блізкага замежжа. Заслуханы і абмеркаваны агульныя даклады акадэмікаў С. Г. Скарапанава (Рэспубліка Беларусь), Б. Пошкуса і А. А. Жучэнкі (Расійская Федэрацыя), Д. Шпаара і А. Хартуна (Германія), В. Ф. Сайко (Украіна), С. Наўроцкага (Польшча), А. І. Будвіціса (Літва).

Са спецыялізаванымі дакладамі выступілі вучоныя Рэспублікі Беларусь — акадэмікі І. І. Ліштван, В. С. Усенка, М. А. Кавалёў, І. М. Багдзевіч, В. Ф. Самерсаў, М. І. Смяян, М. М. Севярнёў, І. С. Нагорскі, У. П. Самсонаў, М. М. Бамбалаў, доктар навук А. С. Мeяроўскі, кандыдаты навук В. Г. Гусакоў, В. В. Лапа, С. М. Зайко, П. П. Ціва. У дыскусіі па дакладах выступілі 15 чалавек.

Сесія Акадэміі аграрных навук Рэспублікі Беларусь па сутнасці ўяўляла Міжнародны форум, які абмеркаваў наступныя пытанні выкарыстання галоўнага сродку сельскагаспадарчай вытворчасці — зямлі. Яна ж вызначыла найбольш актуальныя і пакуль слаба даследаваныя вынікі аграпрамысловых тэхналогій. Галоўная ўвага сканцэнтроўвалася на дзвюх групах фактараў інтэнсіфікацыі: хімізацыі і машынізацыі.

Да адкрыцця сесіі былі выдадзены тэзісы. Аднак улічваючы складанасць праблемы і вялікі навуковы матэрыял, які змяшчаецца ў шэрагу дакладаў, сесія вырашыла апублікаваць іх у часопісе «Весці Акадэміі аграрных навук». Ніжэй публікуюцца скарочаныя даклады С. Г. Скарапанава, Д. Шпаара і П. П. Цівы.

*Член-карэспандэнт У. А. ШЧАРБАКОЎ*